# Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.»

## Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

Адной з самых знакавых падзей XX ст. з'яўляецца Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі. У выніку гэтай рэвалюцыі быў зрынуты Часовы ўрад, да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў, усталявалася дыктатура пралетарыяту. З Кастрычніцкай рэвалюцыяй у Расіі звязаныя глабальныя змены ў сістэме міжнародных адносін, актывізацыя рэвалюцыйных працэсаў і нацыянальна-вызваленчага руху ў свеце.

Разглядаючы перадумовы гэтай гістарычнай падзеі, большасць даследчыкаў звяртаюць увагу на тое, што ў 1917 г. у Расіі адбыліся дзве рэвалюцыі — Лютаўская і Кастрычніцкая. Часовы ўрад, што прыйшоў да ўлады ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі, аказаўся няздольны вырашыць усе пытанні, якія стаялі перад дзяржаўнай уладай. Таму лагічным і заканамерным вынікам стала Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Аднак частка даследчыкаў разглядаюць Кастрычніцкую рэвалюцыю як выпадковасць, што прывяла бальшавікоў да ўлады. У прыватнасці, доктар гістарычных навук, прафесар А. У. Шубін адзначае наступнае: «Хутчэй да перамогі бальшавізму прывёў ланцуг выпадковасцей. У той момант патрабавалася вырашыць надзвычай складаныя задачы. Розныя партыі прапаноўвалі свае праекты. Кадэты, меншавікі і эсэры напачатку мелі нават большую палітычную вагу, чым бальшавікі, але не здолелі скарыстацца сваім шанцам. Улада выпала з іх рук, бальшавікі яе падабралі і здолелі ўтрымаць».

**1.** Якія задачы стаялі перад Часовым урадам пасля Лютаўскай рэвалюцыі? Ахарактарызуйце пазіцыю Часовага ўрада наконт вырашэння гэтых задач. Як бачылі вырашэнне гэтых задач бальшавікі?

**2.** Якія фактары дазволілі бальшавікам павялічыць сваю палітычную вагу? Сярод якіх груп насельніцтва бальшавікі карысталіся найбольшай папулярнасцю?

**3.** Якія фактары паспрыялі поспеху бальшавікоў у кастрычніку 1917 г.?

**4.** Як вы лічыце, прыход да ўлады бальшавікоў у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі быў выпадковы ці заканамерны? Сваю думку аргументуйце.

## Адрозненне факта ад думкі

2 лістапада 1942 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ аб утварэнні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх прыспешнікаў і ўчыненага імі ўрону. За час карпатлівай працы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі было апублікавана 2 тамы дакументаў аб злачынствах нацысцкага рэжыму. Акты і паведамленні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі былі адным з найважнейшых доказаў абвінавачвання ў Нюрнбергу.

У красавіку 2021 г. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь узбудзіла крымінальную справу па фактах генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. За апошнія гады расследаванне выявіла мноства новых фактаў знішчэння нацыстамі мірнага насельніцтва Беларусі.

*Вывучыце ўрыўкі з матэрыялаў расследаванняў і адкажыце на прапанаваныя пытанні.*

**1.** З акта камісіі з прадстаўнікоў вайсковай часці Чырвонай арміі і мясцовай грамадскасці пра зверствы і здзекі нямецкіх фашыстаў над савецкімі людзьмі ў канцлагеры каля мяст. Азарычы Даманавіцкага раёна Палескай вобл.

> Нягледзячы на тое што перад эвакуацыяй з родных вёсак і гарадоў нямецкія ўлады аб'явілі жыхарам, што ім дазваляецца браць з сабой неабмежаваную колькасць рэчаў і прадуктаў харчавання, нямецкія афіцэры і салдаты адабралі ўсе ўзятыя жыхарамі каштоўнасці, а па прыбыцці на месца абрабавалі іх зноў. Людзей распранулі і разулі, адабралі прадукты харчавання, што ў іх былі, не пакінуўшы хлеба нават для маленькіх дзяцей.
>
> Распранутыя і галодныя людзі не мелі права разводзіць вогнішчы, хадзіць у бліжэйшае балота, каб дастаць з-пад імху колькі кропель балотнай вады. Катэгарычна забаранялася набліжацца да дроту. За спробу наблізіцца да загароды расстрэльвалі.

Раз на тыдзень немцы падвозілі да дроту хлеб і кавалкамі, як сабакам, кідалі яго ў натоўп зняможанных людзей. Маленькі кавалачак хлеба пасля сістэматычнага галадання яшчэ больш узмацняў пакуты зняволеных.

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944. — Минск: Беларусь, 1965. — С. 147–149.

**2. У гады нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.) на тэрыторыі Беларусі:**

- знішчана больш за 3 млн мірных грамадзян і ваеннапалонных;
- сагнана ў нямецкае рабства пад пагрозай смерці больш за 380 тыс. чалавек, з якіх шмат хто загінуў у выніку невыносных умоў працы, нягод і катаванняў;
- разбурана і спалена 209 гарадоў, у тым ліку гарады Мінск, Гомель, Віцебск, Полацк, Орша, Барысаў, Слуцк;
- разбурана і спалена больш за 12 000 сельскіх населеных пунктаў;
- знішчана больш за 1270 тысяч пабудоў у гарадах і на сяле.

Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А. И. Шведа. — Минск: Беларусь, 2022. — 175 с.: ил.

**Пацвердзіце фактамі думку: нацысцкая Германія праводзіла на акупаванай тэрыторыі Беларусі палітыку генацыду.**

## Устанаўленне прычынна-выніковых сувязей

А. З рэзалюцыі аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б)

«7–12 студзеня 1933 г. У выніку няўхільнага правядзення палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсім фронце рабочы клас СССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі паспяхова выканаў асноўную задачу пяцігодкі — стварэнне ўласнай перадавой тэхналагічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Ва ўмовах развалу эканомікі капіталістычных краін, пры нечуваным росце ў гэтых краінах беспрацоўя, галечы, голаду — выкананне пяцігодкі ў СССР не за пяць, а за чатыры гады (дакладней, за чатыры гады і тры месяцы) ёсць факт найбольш выдатны ў сучаснай гісторыі...

За перыяд першай пяцігодкі створана ўласная індустрыяльная база рэканструкцыі прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі. З адсталай, дробнасялянскай краіны, якой была старая Расія, СССР выйшаў у першыя шэрагі найбольш развітых у тэхніка-эканамічных адносінах краін».

Б. Суадносіны вытворчасці ў СССР і найбуйнейшых капіталістычных краінах

| Краіны | 1928 г. | | | Конец 1930-х гг. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Электраэнергія, млрд кВт/гадз | Сталь, млн т | Чыгун, млн т | Электраэнергія, млрд кВт/гадз | Сталь, млн т | Чыгун, млн т |
| СССР | 5 | 4 | 3 | 48 | 18 | 15 |
| Германія | 17 | 15 | 14 | 37 | 18 | 15 |
| Англія | 16 | 9 | 7 | 40 | 13 | 8 |
| Францыя | 15 | 9 | 10 | 20 | 8 | 8 |
| ЗША | 113 | 52 | 39 | 188 | 62 | 43 |

1. Чаму ў СССР быў узяты курс на індустрыялізацыю? Якія задачы сталі перад краінай пры яе правядзенні?

2. Чаму прыярытэтная ўвага надавалася развіццю цяжкай прамысловасці?

3. Якое значэнне мела індустрыялізацыя для СССР?

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

А. Выканайце заданне на выбар.

- Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі 1917–1945 гг.». Свой выбар аргументуйце.
- Зрабіце постар, прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі.
- Складзіце аповед ад імя пэўнай асобы пра гістарычныя падзеі, у якіх яна ўдзельнічала.

Б. Вызначце трох асоб, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё Беларусі ў 1917–1945 гг. Сваю думку аргументуйце.